# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 001.32:930(476)"1928/2015"

## Спадчына Анатоля Пятровіча Грыцкевіча праз прызму часу



*У артыкуле, прысвечаным 90-гадоваму юбілею вядомага беларускага гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара А. П. Грыцкевіча (1929–2015), адлюстраваны асноўныя вехі яго жыццёвага шляху і прафесійнай дзейнасці.*

Анатолю Пятровічу Грыцкевічу з юнацкіх гадоў прадказвалася яскравая, цікавая, пладавітая, багатая навуковая будучыня. Адбылося гэта ў далёкім Ташкенце ў гады вайны, дзе 13-гадовы падлетак Толя апынуўся ў эвакуацыі. Аднойчы ў чарзе за хлебам ён чытаў успаміны канцлера Бісмарка, на што звярнуў увагу адзін з суседзяў і сказаў: «Хлапчук, ты далёка пойдзеш». І гэтае прадбачанне збылося. У 1950 г. ён скончыў медыцынскі інстытут, а ў 1955 г. факультэт англійскай мовы інстытута замежных моў. Захапленне гістарычнай навукай пераадолела іншыя планы Анатоля Пятровіча, ён завочна скончыў гістарычны факультэт БДУ. У 1959 г. А. П. Грыцкевіч кардынальна змяніў свой лёс – стаў малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР.

Актыўная навукова-даследчая праца акрэсліла асноўныя праблемы, якімі стаў займацца Анатоль Пятровіч. Кірунак навуковых даследаванняў не заставаўся нязменным, тэматыка іх пастаянна пашыралася. Вывучаючы гісторыю Беларусі перыяду Сярэдневякоўя, А. П. Грыцкевіч даследаваў развіццё мануфактур, рамёстваў, гандлю і г. д. Асабліва яго цікавіла сацыяльна-эканамічнае развіццё прыватнаўладальніцкіх гарадоў Беларусі і ў першую чаргу Случчыны, дзе ўпершыню пасяліліся выбранцы роду Грыцкевічаў. Хутчэй за ўсё па гэтай прычыне ён абраў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэмай кандыдацкай дысертацыі «Сацыяльна-эканамічнае развіццё прыватнаўладальніцкага горада Беларусі ў XVI–XVIII стст. (на матэрыялах Слуцка)». Прадметам аналізу ў доктарскай дысертацыі сталі гэтыя ж бакі развіцця прыватнаўладальніцкіх гарадоў усяго Вялікага Княства Літоўскага.

Даследаванні Анатоля Пятровіча ў галіне сацыяльнай гісторыі, грамадска-палітычнага і эканамічнага развіцця Беларусі далі магчымасць адстойваць важную навуковую выснову аб Вялікім Княстве Літоўскім як беларуска-літоўскім гаспадарстве. Некалькі дзясяткаў артыкулаў ён прысвяціў генеалогіі беларускіх і літоўскіх магнацкіх родаў, каб акрэсліць ролю гэтых саслоўяў у гісторыі Айчыны.

Навуковы інтарэс А. П. Грыцкевіча ахопліваў працэсы, што адбываліся ў праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай цэрквах, таксама праблемы станаўлення пратэстантызму ў Беларусі. Вынікам гэтай працы сталі публікацыі артыкулаў у раздзеле «Канфесіі на Беларусі» ў вучэбным дапаможніку «Беларусазнаўства».

У навуковых даследаваннях А. П. Грыцкевіч звяртаўся да часоў Грамадзянскай вайны, з дакументальнай дакладнасцю апісваў яе падзеі. Сучасныя даследчыкі адзначаюць, што ў яго працах дакументальная аснова бясспрэчная, а новыя метадалагічныя падыходы, прапанаваныя Анатолем Пятровічам, дазваляюць гістарычнай навуцы рухацца наперад.

Актыўная навуковая дзейнасць не перашкаджала Анатолю Пятровічу займацца выкладчыцкай і адміністрацыйнай работай. З заснаваннем Мінскага інстытута культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў) А. П. Грыцкевіч прыйшоў на працу адным з першых, яго пасведчанне мела нумар 1. Пад яго кіраўніцтвам была створана кафедра гісторыі СССР, БССР і замежных краін. Анатоль Пятровіч як загадчык кафедры паспяхова наладзіў работу, сфарміраваў творчы калектыў. Пасля шматлікіх пературбацый кафедра была перайменавана ў кафедру гісторыі Беларусі і музеязнаўства. Да 2006 г. кафедру ўзначальваў А. П. Грыцкевіч. Пад яго кіраўніцтвам плённа працаваў не толькі калектыў кафедры, але і некалькі дзясяткаў студэнтаў спецыяльнасці «Музеязнаўства і ахова культурна-гістарычнай спадчыны». Вырашаючы мнагапланавыя задачы, Анатоль Пятровіч заўсёды быў цярплівы і далікатны з падначаленымі. Гатовы падзяліцца сваімі ведамі, тактоўны, шляхецкі арыстакрат па духу і манерах паводзін – такім ён запомніўся калегам і моладзі. Штодзённыя клопаты – ад арганізацыі вучэбнага працэсу да праблем асабістага жыцця студэнтаў – не дазвалялі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яму праяўляць мітуслівасць, а, наадварот, усё прыкмячаць, разумець жыццёвы і бытавы бок рэальнасці.

Зазначым, што А. П. Грыцкевіч быў чалавекам разважлівым, заўсёды ў творчым пошуку, працалюбівым, таленавітым. Сярод выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта ён карыстаўся вялікай павагай, перш за ўсё за свае энцыклапедычныя веды. Анатоль Пятровіч чытаў лекцыі па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі, спецкурсы па генеалогіі, гісторыі Расіі, Літвы, Украіны, Польшчы, прыватнаўладальніцкіх гарадоў Беларусі XV–XVIII стст., канфесій у Беларусі і інш. Яго заняткі з задавальненнем наведвалі, запрашалі выступаць з навукова-папулярнымі лекцыямі перад сябрамі краязнаўчага таварыства, часта прасілі аб кансультацыях, таму што навуковы аўтарытэт Анатоля Пятровіча быў бездакорны.

А. П. Грыцкевіч перадаваў свой багаты навуковы і метадычны вопыт аспірантам, саіскальнікам і дактарантам. Актыўна фарміравалася яго навуковая школа – былі абаронены дзве доктарскія дысертацыі, навуковым кансультантам якіх з'яўляўся Анатоль Пятровіч, рыхтаваліся да абароны некалькі кандыдацкіх. Яго прафесійная назіральнасць, жыццёвы вопыт, адметны талент зносін з калегамі дазвалялі знаходзіць нестандартныя падыходы як у размове з людзьмі, так і ў рабоце. Менавіта таму Анатоля Пятровіча часта запрашалі ў якасці апанента па кандыдацкіх і доктарскіх дысертацыях, рэцэнзента і навуковага рэдактара манаграфій і падручнікаў, а таксама ў якасці дакладчыка на навуковыя канферэнцыі за мяжу.

Нягледзячы на актыўную і напружаную навуковую, выкладчыцкую і арганізацыйна-метадычную працу, А. П. Грыцкевіч знаходзіў час, каб займацца грамадскай дзейнасцю. Імя яго як аўтарытэтнага навукоўца было вядома далёка за межамі Беларусі, што дазваляла Анатолю Пятровічу кіраваць дзейнасцю аб'яднання «Бацькаўшчына», займаць пасады правадзейнага сябра Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі (Масква), гісторыка-радаводнага таварыства ў Маскве, Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, уваходзіць у рэдакцыйны савет Беларускай Энцыклапедыі і Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, рэдкалегію «Гісторыі чатырох народаў» (г. Люблін).

Штодзённыя клопаты на кафедры не перашкаджалі А. П. Грыцкевічу працягваць актыўную навуковую дзейнасць. Ён надрукаваў больш за тысячу навуковых артыкулаў у часопісах і энцыклапедыях. У 2000 г. пад яго навуковай рэдакцыяй выйшла першая кніга «Славутыя імёны Бацькаўшчыны», у якой Анатоль Пятровіч выступае і як аўтар 8 артыкулаў. З апошніх значных работ А. П. Грыцкевіча вядомы «Заходні фронт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РСФСР у 1918–1920 гады» і «Старонкі нашай мінуўшчыны» (2009; зборнік артыкулаў пра знакавыя асобы і падзеі нашай гісторыі). Адзначым, што Анатоль Пятровіч як удумлівы даследчык імкнуўся ў сваім навуковым пошуку дайсці да сутнасці з'явы.

Анатоль Пятровіч Грыцкевіч пакінуў наступным пакаленням багатую навуковую спадчыну, цэнтральнае месца ў якой займае абгрунтаванне палажэння аб Вялікім Княстве Літоўскім як беларуска-літоўскім гаспадарстве са своеасаблівай палітычнай, матэрыяльнай, духоўнай культурай. Пад яго кіраўніцтвам калектыў кафедры перайшоў на выкладанне ўсіх прадметаў на беларускай мове і дастаткова эфектыўна трансліраваў азначаную ідэю сярод студэнтаў універсітэта. Аўтарытэт Анатоля Пятровіча спрыяў вызначэнню кірунку навуковых даследаванняў і сувязей кафедры, успрыманню калектывам строгай навуковай і вытворчай дысцыпліны.

***М. А. Бяспалая***

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 25.01.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ